# З МАСТАЦТВАМ ПА ЖЫЦЦІ

***Імя выдатнага мастака Мікалая АПІЁКА ведаюць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. А з горадам на Дзвіне ў Мікалая Апанасавіча звязана шмат успамінаў. Ён – выпускнік Віцебскага мастацка-графічнага педагагічнага вучылішча, традыцыі якога працягвае мастацка-графічны факультэт нашай альма-матэр.***

Мікалай Апіёк з цяплынёй успамінае свае студэнцкія гады. Таленавіты мастак прызнаецца, што менавіта ў Віцебску ён знайшоў дарогу ў свет мастацтва. І сёння ў памяці Мікалая Апанасавіча захаваліся моманты ўступных іспытаў. Як ён, звычайны вясковы хлопец, які не меў дасканальнай мастацкай базы, прыехаў паступаць у вучылішча. Мікалай Апіёк атрымаў на экзамене чатыры балы, бо тады нават не ведаў такога паняцця, як форма, і што гэта значыць кампанаваць. Менавіта выкладчыкі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча навучылі яго ўсяму і далі пуцёўку ў жыццё. З удзячнасцю мастак успамінае Валянціна Дзежыца, які навучыў бачыць яго прыгажосць у простым. У Мікалая Апіёка была моцная група. Ён вучыўся з такімі будучымі таленавітымі мастакамі, як Павел Арцёмаў, Анатоль Ільіноў.



Затым Мікалай Апанасавіч паступіў у Мінскае мастацкае вучылішча і працягнуў там навучанне на 5 курсе.

Напрыканцы снежня ў выставачнай зале мастацка-графічнага факультэта ВДУ адбылося адкрыццё выставы «Героі свайго часу». Мікалай Апіёк прызнаўся, што гэта невыпадкова, бо Віцебск для яго – горад пачатку яго творчасці. Мастаку важна падзяліцца сваімі ўменнямі і ведамі з моладдзю.

У творчасці Мікалай Апіёк аддае перавагу розным жанрам станковага жывапісу: партрэту, тэматычнай кампазіцыі, пейзажу і нацюрморту, а таксама працуе ў станковай графіцы і сцэнаграфіі.

На выставе ў асноўным былі прадстаўлены партрэты. Героямі палотнаў Мікалая Апіёка сталі знакавыя персанажы беларускай гісторыі і культуры. Адной з цэнтральных у творчасці мастака з'яўляецца серыя партрэтаў «Акцёры і ролі», дзе прадстаўлены вобразы беларускіх акцёраў у гістарычных вобразах.

Пасля адкрыцця выставы адбылася сустрэча мастака са студэнтамі МГФ, дзе Мікалай Апанасавіч расказаў аб сваіх асноўных творах і падзяліўся мастацкім вопытам. Машэраўцы ж змаглі задаць пытанні, якія іх цікавілі.

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**